За правы чалавека

Віцебскі рэгіянальны праваабарончы бюлетэнь

№ 4 (87) Красавік 2014 г.

Алена Каваленка пакараная штрафам у памеры 20 базавых велічынь

Гэткае пакараньне прысудзілі віцебскай актывістцы за пікет супраць удзелу ва ўжо мінулых мясцовых выбарах, які адбыўся 22 сакавіка ў Віцебску. Працэс у Першамайскім райсудзе працягваўся менш за паўгадзіны.

Паводле прысутнага на судзе праваабаронцы Паўла Левінава, Алена Каваленка адмовілася даваць нейкія тлумачэньні: **«Алена сказала толькі, што падчас пікету выражала сваю грамадзянскую пазыцыю. І такім чынам рэалізоўвала сваё канстытуцыйнае права на публічнае выказваньне сваіх меркаваньняў. Менавіта таму яна лічыць, што прасіць дазволу ўладаў на падобныя дзеяньні ня мае сэнсу. Аднак судзьдзя гэткіх аргумэнтаў не прыняла і абвясьціла пастанову: аштрафаваць Алену Каваленка за ўдзел у несанкцыянаванай масавай акцыі на 20 базавых велічынь, што**



складае 3 мільёны рублёў».

Судзіла Алену Каваленка тая самая судзьдзя Першамайскага райсуду Натальля Карабліна, якая даўней пакарала другога ўдзельніка той самай акцыі, сябра КХП БНФ Яна Дзяржаўцава. Спадар Дзяржаўцаў атрымаў у якасьці пакараньня 7 сутак арышту, бо быў прызнаны арганізатарам акцыі, да таго ж, паводле міліцэйскіх зьвестак, ён зьдзейсьніў ужо другое правапарушэньне на працягу гэтага году.

22 сакавіка Ян Дзяржаўцаў з Аленай Каваленкай выйшлі да СШ № 46 з плякатам «Байкот выбарчаму фарсу». А потым Ян Дзяржаўцаў дэманстратыўна парваў запрашэньні на выбары, бо лічыць, што ў Беларусі няма свабоднага волевыяўленьня грамадзянаў. Сябра КХП БНФ Сяргей Каваленка, муж Алены Каваленкі, зьняў акцыю на відэа і выклаў у інтэрнэт.


На Віцебшчыне забаранілі правядзеньне пікетаў у гадавіну Чарнобыля



У Віцебску і Наваполацку мясцовыя ўлады забаранілі пікеты, прымеркаваныя да чарговай гадавіны Чарнобыльскай трагедыі. У Наваполацку заяўку на пікет падаваў **Яўген Парчынскі**, на што атрымаў адказ ад намесьніка старшыні гарвыканкаму **Альберта Шакеля**, які напісаў заяўніку, што пікет забараняецца, бо заяўка на яго правядзеньне пададзеная з парушэньнем дзеючага заканадаўства.

Аналягічная прычына забароны акцыі і ў Віцебску: як паведаміў адзін з заяўнікаў імпрэзы **Ян Дзяржаўцаў**, пікет забаронены намесьніцай кіраўніка адміністрацыі Чыгуначнага раёну **Натальляй Ляпёшкінай** з прычыны таго, што яго арганізатары падалі сваю заяўку з парушэньнем — не далучылі да яе дамовы, прадугледжаныя рашэньнем № 881 Віцебскага гарвыканкаму. Згодна з гэтым рашэньнем, для атрыманьня дазволу ад уладаў на правядзеньне масавых мерапрыемстваў іх арганізатары абавязаныя папярэдне заключыць дамовы з шэрагам дзяржаўных службаў. Пералічаныя ў рашэньні гарвыканкаму службы ад заключэньня дамоваў аб абслугоўваньні масавых мерапрыемстваў, як правіла, ухіляюцца.

БАРДА НЕ ПУСЬЦІЛІ НА СТАДЫЁН



Андрэй Мельнікаў ня змог трапіць на футбольны матч. У дзень адкрыцьця футбольнага сэзону бард выграшыў далучыцца да фанатаў "Воршы", якія пачыналі свой праход да стадыёну ад Гарадзішча. Там ён засьпяваў для прыхільнікаў мясцовых заўзятараў песьню "Ворша".

На жаль, на гарадзкі стадыён вядомага беларускага барда не пусьцілі - супрацоўнікі міліцыі палічылі небясьпечным знаходжаньне на стадыёне акустычнай гітары і забаранілі Мельнікаву ўваход. Паколькі арганізаванай камэры захоўваньня рэчаў на стадыёне і побач зь ім няма, барду прыйшлося сысьці, бо пакідаць гітару на адкрытым паветры на звычайным століку ніхто ня стане.

Ня ў меру штраф – ня ў меру паклёп

18 красавіка судзьдзя Кастрычніцкага раёну Віцебску Яўген Буруноў, разглядзеўшы справу Паўла Тулубенскага, вынес пастанову аб пакараньні яго штрафам. Згодна з рашэньнем, сп. Тулубенскі павінен будзе заплаціць дзяржаве 3 млн. рублёў за тое, што ён нібыта распаўсюджваў паклёпніцкія выдумкі ў дачыненьні да дырэктара таварыства з дадатковай адказнасьцю «Навукова-вытворчае прадпрыемства "Мера"» Сяргея Літвінчука.

Усё распачалося некалькі месяцаў таму. Тады два дзясяткі грамадзян, што жывуць у раёне кінатэатру «Мір», зьвярнуліся да прэзыдэнта Лукашэнкі зь лістом, у якім скардзіліся на дзеяньні віцебскіх уладаў і кіраўніцтва ТДА «Навукова-вытворчае прадпрыемства "Мера"». Гэтая камэрцыйная структура будуе шматпавярховік і гандлёва-адміністрацыйны будынак у квартале вул. Леніна, вул. Чэхава і вул. Грыбаедава, вул. Суворава.

У сваім звароце жыхары двух дамоў, якія плянуецца зьнесьці ва ўгоду бізнэс-інтарэсам НВП «Мера», — № 35 па вул. Суворава і № 66-а па вул. Леніна — паведамлялі кіраўніку дзяржавы: зьяўляючыся дырэктарам ТДА «НВП Мера», С. Літвінчук плянамерна захоплівае нерухомасьць і вялікія ўчасткі зямлі ў прыватную ўласнасьць, робіць замах на зямельныя ўчасткі грамадзян у цэнтры гораду, выганяе іх, ушчыльняе дваровыя тэрыторыі, ультыматыўна патрабуе ад жыхароў дамоў, разьмешчаных паміж яго будоўлямі і кінатэатрам «Мір», добраахвотна адмовіцца ад свайго жытла і зямельных участкаў на ягоную карысьць.



Паводле практыкі, што склалася, працаўнікі адміністрацыі прэзыдэнта пераслалі зварот віцебчукоў ў Віцебскі абласны выканаўчы камітэт, каб са скаргай і скаржнікамі разабраліся мясцовыя чыноўнікі.

А пасьля... па заяве С. Літвінчука старшы інспэктар ААПП Кастрычніцкага РАУС Віцебску маёр міліцыі Аляксей Паўлаў склаў адміністрацыйны пратакол у дачыненьні да аднаго са скаржнікаў — Паўла Тулубенскага — паводле арт. 9.2 (паклёп) Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэньнях Рэспублікі Беларусь.

Падчас разгляду справы ў судзе высьветлілася, што жыхары наадрэз адмовіліся перасяляцца з прычыны нераўнацэннасьці кошту цяперашняга жытла і таго жытла, якое было паабяцанае камэрсантамі. Аднак нават пасьля пісьмовай адмовы перасяляцца, прадстаўнікі ТДА «НВП Мера» неаднаразова дапякалі жыхарам ўгаворамі і абяцанкамі. Гэтыя дзеяньні жыхары ўспрынялі як спробы захопу іх жытла і зямельных участкаў камэрцыйнай фірмай.

Павал Тулубенскі прызнаў у судзе, што, магчыма, ён і іншыя падпісанты звароту да Лукашэнкі ахарактарызавалі дзеяньні камэрсантаў ня тымі словамі. Аднак, паводле яго слоў, дзеяньні камэрсантаў сапраўды псыхалягічна ўспрымаліся як адкрыты замах на іх нерухомую маёмасьць. Было незразумела, якім чынам і за якія заслугі ТДА «НВП Мера» атрымала ва ўласнасьць ажно шэсьць участкаў зямлі ў цэнтры горада, ці была выканаваная дзяржаўнымі органамі працэдура перадачы гэтых участкаў, і ці пакінуць пасьля адмовы перасяляцца ў спакоі яго і ягоную састарэлую маці — ардэнаносца.

Сяргей Літвінчук растлумачыў суду, што ён дзейнічаў згодна з законам і ў сілу рашэньняў Віцебскага выканаўчага камітэту і праектнага інстытуту «Віцебскгапразем». Ён паведаміў, што лічыць сябе пацярпелым, абгавораным, бо ў скарзе жыхароў дамоў № 35 па вул. Суворава і № 66-а па вул. Леніна, накіраванай прэзыдэнту краіны, утрымліваецца абразьлівыя і паклёпніцкія зьвесткі. Больш таго, з-за скаргі Лукашэнку пацярпеў ягоны бізнэс — у цяперашні час будаўніцтва комплексу прыпыненае і ў дачыненьні да ТДА «НВП Мера» вядуцца праверкі і разгляды з боку дзяржорганаў. Праўда, ён пацьвердзіў, што дасылаў лісты з прапановамі жыхарам зносімых дамоў перасяліцца ў добраўпарадкаванае жытло.

Пасьля нядоўгага разгляду, судзьдзя Кастрычніцкага раёну Віцебску Яўген Буруноў абвясьціў рашэньне: у дзеяньнях Паўла Тулубенскага праглядаецца склад адміністрацыйнага правапарушэньня — паклёп у дачыненьні да дырэктара ТДА «НВП Мера» Сяргея Літвінчука. І на гэтай падставе аштрафаваў сп. Тулубенскага на суму ў 3 млн. рублёў.

Аднак застаецца пытаньне: ці будуць пакараныя штрафамі астатнія шаснаццаць падпісантаў скаргі да кіраўніка дзяржавы, або ў краіне дзейнічае выбарчае прымяненьне Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэньнях? Бо, фактычна, Павал Тулубенскі быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасьці толькі з-за таго, што на канпэрце са скаргай прэзыдэнту менавіта яго хатні адрас быў пазначаны ў якасьці зваротнага адрасу.

Выдаўца «Крывінкі» аштрафавалі на 7 з паловай мільёнаў рублёў

Штраф памерам 50 базавых велічынь – максымальны паводле ч.2 артыкулу 22.9 КаАП. Суд прызнаў, што Георгі Станкевіч парушыў правілы распаўсюду газэты "Крывінка" і патрабаваньні да выдавецкай дзейнасьці. З матэрыялаў справы высьветлілася, што адміністрацыйны перасьлед Георгія Станкевіча распачаўся з ананімкі. Прычым у ёй не было ані слова непасрэдна пра газэту "Крывінка".

"Калі я ў судзе знаёміўся з матэрыяламі справы, то ўбачыў там ксеракопію ліста, які нібыта даслалі ў адміністрацыю прэзыдэнта мае аднавяскоўцы, — гаворыць вядомы паэт і бард Георгі Станкевіч. — Хачу заўважыць, што ў вёсцы Старыя Ранчыцы, дзе я жыву, засталіся пераважна пэнсіянэры, і ўсе яны да мяне добра ставяцца. І раптам я чытаю, што нейкія "аднавяскоўцы" просяць "спыніць Станкевіча", бо ён "палівае брудам народ і ўрад". І што гэта мне будзе такі "падарунак ад Дзядулі Мароза" — ліст быў напісаны недзе напрыканцы студзеня. А ўнізе яшчэ намаляваная кветачка. Дзівосы нейкія! Каб людзі малявалі кветачкі на лісьце ў адміністрацыю — у гэта я ня веру! Ліст выглядае на нейкі дурны жарт ці падробку, але гэта нікога не зьбянтэжыла. Яго перанакіравалі ў Віцебскі аблвыканкам і абласную ўправу міліцыі, а адтуль — ужо да нас у Бешанковічы. І ў справе ёсьць дакумэнт, дзе гаворыцца, што захады па гэтай "ананімцы" трэба зрабіць да 13 сакавіка".

Станкевіч мяркуе, што менавіта з-за гэтай пасьпешлівасьці судзьдзя Натальля Рэўт не дазволіла яму запрасіць на судовы працэс ні перакладчыка, ні адваката зь Менску. З-за настойлівасьці падсуднага яго выдалілі з судовай залі нібыта за парушэньне парадку. Паводле судовай пастановы, ён пакінуў залю сам і дэманстратыўна.



Для Георгія Станкевіча абвінавачаньне за распаўсюд "Крывінкі" — ужо трэцяе. У 2010 годзе ён быў пакараны за гэта ж штрафам у 20 базавых велічынь, а ў 2012 годзе штраф склаў ужо 40 базавых. Заснавальнік і рэдактар самвыдатаўскай газэты лічыць, што перасьлед за "Крывінку" — гэта палітычная замова з мэтаю абмежаваць ягоным землякам доступ да праўдзівай інфармацыі. Каб гэтага ня здарылася, Георгі Станкевіч заснаваў яшчэ й незалежны інфармацыйны рэсурс http://beshankovichy.by, дзе таксама зьмяшчаюцца крытычныя артыкулы пра мясцовыя праблемы. Апошнюю пастанову райсуду Георгі Станкевіч зьбіраецца аспрэчыць у вышэйшай судовай інстанцыі.

Суд паверыў чыноўнікам Гарадоцкага райвыканкаму

У судзе Гарадоцкага раёну завяршыўся разгляд скаргі **Яна Дзяржаўцава** на парушэньне адказнымі работнікамі Гарадоцкага райвыканкаму закону «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб». Судзьдзя **Алена Віхаценка** скаргу актывіста не задаволіла, паверыўшы сьведцы — начальніку аддзелу жыльлёва-камунальнай гаспадаркі райвыканкаму **Тацьцяне Пушковай.**

Нагадаем, 14 лістапада 2013 году Ян Дзяржаўцаў зьвярнуўся ў Гарадоцкі райвыканкам зь пісьмовай заявай, у якой прасіў растлумачыць, на якой падставе ладзілася высечка елак у межах паласы адводу аўтамабільнай дарогі Р-115 Віцебск-Гарадок на ўчастку 27-46 км. Аднак адказу па сутнасьці заявы ён не атрымаў аж дагэтуль, таму і прасіў суд прымусіць службовых асоб даць яму такі адказ у адпаведнасьці з законам «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб».

У судзе юрыст выканкаму заявіла, што насамрэч супрацоўнікі выканкаму вышэйзгаданага закону не парушалі, а накіравалі ліст Яну Дзяржаўцаву яшчэ 27 лістапада 2013 году. Згодна з гэтым лістом, які Ян Дзяржаўцаў упершыню ўбачыў толькі ў судзе, елкі ўздоўж шашы былі высечаныя на падставе распараджэньня губэрнатара Аляксандра Косінца і адпаведнага рашэньня Гарадоцкага райвыканкаму.



На думку Яна Дзяржаўцава, ліст, які яму нібыта быў накіраваны 27 лістапада, быў складзены заднім днём — непасрэдна перад судом. Тым больш, што літаральна напярэдадні пазначанай у лісьце даты яму быў дасланы яшчэ адзін ліст — папярэдні адказ, у якім кіраўнік спраў выканкаму інфармаваў актывіста, што ягоны зварот будзе разгледжаны аддзелам жыльлёва-камунальнай гаспадаркі. Гэты папярэдні ліст датаваны 26 лістапада, і Ян Дзяржаўцаў сумняваецца, што чыноўнікі аддзелу ЖКГ сапраўды ўсяго за адзін дзень здолелі падрыхтаваць і даслаць яму поўны і ўсебаковы адказ.

Адзіным доказам таго, што адказ сапраўды быў накіраваны заяўніку ў належны тэрмін, а ня быў сфабрыкаваны заднім днём, сталіся словы выкліканага ў суд сьведкі – начальніка аддзелу жыльлёва-камунальнай гаспадаркі райвыканкаму Тацьцяны Пушковай. Судзьдзя Віхаценка палічыла, што слоў працаўніцы выканкаму аб тым, што выканкам не парушыў заканадаўства, цалкам дастаткова. З журналам выходнай карэспандэнцыі, у якім фіксуюцца ўсе дасылаемыя выканкамам лісты, судзьдзя не знаёмілася. Згодна з рашэньнем судзьдзі Віхаценка, адказныя асобы Гарадоцкага райвыканкаму не парушылі закону «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб», і Яну Дзяржаўцаву ў задавальненьні яго скаргі трэба адмовіць.

Старшыню Свабоднага прафсаюзу ня прынялі ў вэтэранскую арганізацыю

Пры прадпрыемстве ААТ «Полацак-Шкловалакно» ўжо даўно створаная грамадзкая арганізацыя вэтэранаў вайны і працы ААТ «Полацак-Шкловалакно». Звычайна ў гэтую арганізацыю прымаюць работнікаў прадпрыемства, якія выйшлі на пэнсію. Для вэтэранаў часам арганізуюцца канцэрты, экскурсіі, да дня вэтэрана выдаюць маленькую матэрыяльную дапамогу ад заводу.

Ня ўсе пэнсіянэры імкнуцца туды ўступіць, але і, як высьветлілася, ня ўсіх туды прымаюць. Старшыню Свабоднага прафсаюзу працоўных «Шкловалакна» Віктара Стукава адмовіліся прыняць у арганізацыю, хоць пасьпелі ўзяць ўнёскі за год.

Распавядае Віктар Стукаў:

— У арганізацыю вэтэранаў пэнсіянэраў прымаюць па іх вуснай заяве. Прыйшоў я ў іхны габінэт і заявіў аб жаданьні ўступіць у іх арганізацыю. Працаўніца грамадзкай арганізацыі палічыла мой стаж, які склаў больш за 30 гадоў, узяла гадавыя ўнёскі ў памеры 2% месячнай пэнсіі і павіншавала з уступленьнем ў грамадзкую арганізацыю.

Праз тыдзень мне патэлефанавала старшыня першаснай арганізацыі вэтэранаў вайны і працы ААТ «Полацак-Шкловалакно» Дзьмітрыева Вера Сямёнаўна і папрасіла: «Яшчэ раз прыйдзеце — праверыць, ці дастаткова ў вас стажу працы». Старшыня Дзьмітрыева старанна (з дакладнасьцю да дня) падлічыла мой працоўны стаж і зноў павіншавала мяне з уступленьнем у арганізацыю. Але на гэтым прыгоды ня скончыліся. Яшчэ праз тыдзень старшыня вэтэранаў патэлефанавала і сказала, што мяне можа прыняць толькі рада арганізацыі, якая адбудзецца праз два тыдні.



Калі ўсіх прымаюць без цырымоніяў, то для старшыні Свабоднага прафсаюзу вырашылі аказаць гонар і сабраць раду грамадзкай арганізацыі вэтэранаў. На сходзе прысутнічала больш за 20 чалавек, 19 чальцоў рады вэтэранаў, 4 кандыдаты на прыём у арганізацыю і ад адміністрацыі ААТ «Полацак-Шкловалакно» начальнік аддзелу кадраў Юры Краўчанка.

На пачатку паседжаньня з помпай прынялі ў арганізацыю траіх пэнсіянэраў, не забыўшыся пералічыць іх ганаровыя граматы і прэміі. Калі чарга дайшла да мяне, старшыня вэтэранаў Дзьмітрыева зачытала ўсе мае звальненьня за парушэньні заканадаўства аб працы і зрабіла выснову, што мяне нельга прыняць у арганізацыю.

Выступіў ганаровы сябра рады вэтэранаў Раман Прыбышчук (былы работнік першага аддзелу бясьпекі), сказаўшы, што ў мяне няма маральнага права быць чальцом вэтэранскай арганізацыі.

Заслужаная працаўніца прамысловасьці, герой сацпрацы С.В. Цура спытала: «Калі мы вас запросім на сустрэчу з моладзьдзю, вы і там будзеце агітаваць за ўступленьне рабочых у Свабодны прафсаюз?» Адказваючы на пытаньне, давялося распавесьці вэтэранам пра пятнаццацігадовую дзейнасьць Свабоднага прафсаюзу Беларускага на заводзе «Шкловалакно», гэта было адзіным станоўчым момантам паседжаньня.

Паседжаньне рады вэтэранаў «Шкловалакна» было падобнае да партыйнага сходу камуністаў з 80-х гадоў, што нават было цікава — зазірнуць у гісторыю. Пасьля ўсіх абмеркаваньняў у выніку галасаваньня тры жанчыны з рады вэтэранаў прагаласавалі за прыняцце мяне ў арганізацыю, астатнія супраць.

Цяпер я ў сумневах — ці ўступіў я ў арганізацыю, або не? Унёскі зь мяне ўзялі, і ніяк ня могуць мне іх вярнуць. Паводле іх палажэньня аб вэтэранскай арганізацыі рада мае права прыняць у арганізацыю, але права адмовіць у прыёме ў рады няма! Старшыня вышэйстаячай Полацкай раённай рады вэтэранаў Галіна Муравей пісьмова мне паведаміла, што пацьвердзіць маё сяброўства ў першаснай вэтэранскай арганізацыі ААТ «Полацак-Шкловалакно» не ўяўляецца магчымым.

Разгледзеўшы сытуацыю на паседжаньні Рады Свабоднага прафсаюзу Беларускага, прынятае рашэньне аб стварэньні вэтэранскага кірунку ў працы Свабоднага прафсаюзу. Таму што арганізацыі вэтэранаў пры прадпрыемствах носяць ярка выяўленую ідэалягічную афарбоўку.

Бюлетэнь “За правы чалавека” выдаецца праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
Наклад 299 асобнікаў.
Пры падрыхтоўцы бюлетэня выкарыстоўваліся матэрыялы сайта http://prava.vitebsk.cc і іншыя Інтэрнэт-рэсурсы.